# Экскурсія па малой Радзіме
# “З гісторыі роднай вёскі”

**Нітка маршрута:** аг.Першамайск – Свята-Пакроўская царква – касцёл Узвышэння Святога Крыжа – будынак старой школы – Абеліск ахвярам фашызму – гісторыка-краязнаўчы музей.

Добры дзень! Мяне завуць Гудач Кацярына. Я з’яўляюся экскурсаводам школьнага гісторыка-краязнаўчага музея і менавіта са мной вы правядзеце бліжайшы час. Ці гатовы вы пабываць на май малой Радзіме? Так! Тады я запрашаю вас на Першамайскую зямлю. Маршрут наш цікавы і просты. У добры шлях, сябры!

Вёска, у якой я нарадзілася і жыву, называецца светла і прыгожа – Першамайская. Вядома яна з 15 стагоддзя. Да гэтага наша вёска мела шмат цікавых назваў: Забалоцце, Сабакінцы, Сабокінцы, Пакроўка, Нарбутова. Існуе некалькі легенд, якія тлумачаць паходжанне нашай вёскі:

1. За паспяховую і добрую службу гэтыя месцы, дзе былі лясы падараваны царом падпалкоўніку па прозвішчы Сабакін. І ў 1450 годзе ён прыехаў у гэтыя мясціны для агляду мясцовасці. На месцы Першамайска была невялікая, але вельмі прыгожая дубовая мясцовасць. Ён вырашыў паставіць хаціну для прыезду на паляванне. Для атрымання такой пабудовы падпалкоўнік пасяліў тут сваю сям’ю, назваў гэту мясціну ад свайго прозвішча Сабакіна. З 1450 года стала пабольшвацца насельніцтва.

2 легенда тлумачыць назву вёскі так:

Там, дзе цяпер бальніца жыла пані, якая мела псарню каля ста сабак. Сабакі кідаліся на людзей, і па-гэтаму вёску назвалі Сабакінцамі.

З 1954 г. вёска атрымала назву Першамайская, у гонар свята першага Мая. Так завецца яна і сёння. Але многія састарэлыя людзі нашай мясцовасці ўжываюць назву Сабакінцы.

-Але не толькі сваім паходжаннем ганарыцца наша вёска. Вось гэта наш гонар – Свята-Пакроўская царква.

Поўная назва царквы – царква мацеры Божай Пакровы. У пачатку царква была драўлянай. У царкве была Цудатворная ікона Багародзіцы невядомага майстра, пры якой вісеў вотум з серабра, ахвяраваны праз Станіслава Ляшчынскага з надпісам на польскай мове.

У 1830 годзе на месцы драўлянай царквы пабудована царква з каменю і цэглы ў стылю неакласіцызму з элементамі барока.

31 студзеня 1864 года пры Сабакінскай царкве адкрыта народнае вучылішча. Вучняў у гэтым вучылішчы было 30 хлопчыкаў, 20 з якіх

праваслаўнай, а астатнія рымскай веры. У 1948 годзе была пашкоджана пажарам. Але хутка адноўлена на сродкі прыхажан. І вось ў такім выглядзе яна радуе нас сёння.

-Не меньшую увагу да сябе звяртае наш касцёл “Узвышэння святога крыжа”, які адкрываецца ў1929 годзе і утвараецца Сабакінская парафія.

Тагачаснае месцазнаходжанне касцёла не супадае з сучасным . У той час касцёл знаходзіўся на паўднёвым усходзе вёскі, а калі дакладней, то каля сучасных праваслаўных могілак, меў выгляд звычайнага драўлянага дома.

Будаўніцтва касцёла вялося пад кіраўніцтвам ксяндза Адольфа Гродзіса.

У 1938 годзе пабудавалі касцёл – святыня сучаснага стылю. Але ў час Вялікай Айчыннай вайны будынак згарэў.

У 1989-1990 гадах парафіяне сабралі добраахвотныя ахвяраванні.

І у канцы 1990 года касцёл быў адрамантаваны. Узведзены вежы, вышыня якіх дасягае больш як 20 м.

-Звяртае ўвагу і вось гэты будынак. Помнік архітэктуры XIX ст. Пабудаваны як царкоўна - прыхадская школа ў 1864 годзе.

У час Вялікай Айчыннай вайны ў будынку размяшчалася нямецкая камендатура і гестапа. Успаміны ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны сведчаць а тым, што ад будынка і да возера быў пракапаны глыбокі падземны тунель, па якім немцы вадзілі на расстрэл палонных партызан ці мясцовых жыхароў, якія не жадалі падпарадкоўвацца новай уладзе.

У пасляваенны час будынак выкарыстоўваўся як мясцовая навучальная ўстанова, а затым як дом-інтэрнат для дзяцей, якія жылі далёка ад школы.

-Гэты абеліск сведчыць аб трагічных момантах існавання нашай вёскі. І сведчыць аб ушанаванні памяці нашых воінаў і мясцовых жыхароў, якія загінулі ў гады Вялікай айчыннай вайны. Абеліск пастаўлены у 1975 годзе. Тут знаходзяцца брацкія магілы трох невядомых партызан з атрада генерал - маёра П.П.Капусты; васьмі мірных жыхароў, расстраляных у 1943 годзе гітлераўцамі.

Тэкст надпісу на помніку: «Вечная слава павшим в боях с немецкими захватчиками за свободу нашей Родины 1941 – 1945 гг.» Даглядаецца вучнямі школы.

- Апошні аб’ект нашай экскурсіі – гісторыка-краязнаўчы музей школы.
Гэта важная падзея ў жыцці школы адбылася 22 красавіка 1982 года. Мэта стварэння гісторыка-краязнаўчага музея была выказана рабятамі школы на занятках гуртка “ Юны краязнавец” у 1980 годзе, калі яны займаліся вывучэннем гісторыі дзейнасці партызанскага атрада імя Катоўскага

брыгады імя Ленінскага камсамола, які дзейнічаў на тэрыторыі Першамайскага сельсавета.

Ідэйным кіраўніком і арганізатарам музея з’яўлялася настаўніца гісторыі Антухевіч Людміла Канстанцінаўна. З першых дзён свайго адкрыцця школьны гісторыка – краязнаўчы музей стаў цэнтрам ідэйна-патрыятычнага выхавання вучняў.

Мінула 36 гадоў з дня адкрыцця музея. Зараз у музеі 5 пакояў і сховішча экспанатаў. За гады існавання гісторыка-краязнаўчага музея сюды наведалася 85 тысяч чалавек. Тут пабывалі і жыхары суседніх з намі краін : расіяне, літоўцы, палякі, украінцы і з далёкага замежжа - Германіі
-Мы запрашаем у наш музей, дзе захоўваецца былое, цяперашняе, наша творчасць. Вы ўбачыце і ўчуеце многа цікавага аб нашым краі, аграгарадку, школе, цікавых людзях.

І мы амаль упэўнены – вам спадабаецца!

-Вось і закончылася наша падарожжа. Вы пазнаміліся з маёй вёскай і некаторымі гістарычнымі аб’ектамі. Яшчэ многа можна гаварыць аб гістарычных мясцінах і помніках Першамайскага краю. Але гэта ўжо зусім іншая гісторыя!